ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
19 ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6(1527)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### На бюро камітэта камсамола

супрацоўнікаў і выкладчыкаў разглядалася работа штаба «КП». Работа камсамольскіх арганізацый кафедраў грамадскіх навук і апарату кіравання ў гэтым напрамку прызнана не адпавядаючай патрабаванням сённяшняга часу. Старшыням штабоў Л. Чухуставай і А. Сяргейчыку за прагалы ў арганізацыі работы аб'яўлены вымовы.

Ю. ПОЗНЯК,
старшыня штаба «КП»
супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

### Кінаклуб

«Праблемны фільм», ініцыятарам стварэння якога быў супрацоўнік фізфака М. Далгіх, пачынае рабіць свае першыя крокі. Ужо адбыўся кінавечар памяці У. Высоцкага. Якім быць клубу — рашаць вам, камсамольцы універсітэта, сярод якіх, напэўна, нельга знайсці абыякавых да кіно. Просьба свае прапановы, заўвагі, добрыя парады несці ў пакой № 306 галоўнага корпуса.

С. СЯРГЕЕЎ,
сакратар камітэта камсамола
супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

### Выязная навуковая

сесія Навуковага лацінаамерыканскага студэнцкага семінара пры Маскоўскім Доме дружбы адбылася ва універсітэце. У рабоце сесіі прынялі ўдзел прадстаўнікі Кубы, Гандураса, Парагвая, Мексікі, Перу, Калумбіі, СССР, якія разгледзелі ўплыў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі на сацыяльныя працэсы ў Лацінскай Амерыцы. З асноўным дакладам выступіў старшыня навуковаметадычнага савета семінара загадчык сектара сацыяльных праблем Інстытута Лацінскай Амерыкі АН СССР кандыдат гістарычных навук З. В. Іваноўскі.

Замежныя студэнты — навучэнцы ВНУ Масквы пазнаёміліся з вядомымі мясцінамі нашага горада, наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь і Курган Славы, сустрэліся са сваімі равеснікамі ў час адпачынку ў кафэ «Гаўдэамус».

А. САМУЙЛІЧ,
І. САМОВІЧ.

### Да ўвагі чытачоў

даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна даводзіць, што па панядзелках, аўторках, серадах з 9.30 да 18.00 працуе выстаўка навінак літаратуры.

Ж. КРУГЛІКАВА.

*са святам!*




*НА ЗДЫМКУ ІХ СЯМЁРА. Ва універсітэце — амаль семдзесят. Воіны - інтэрнацыяналісты. Яны з ліку тых, хто не так даўно глядзеў у вочы смерці, хто са зброяй у руках сустракаў ворага на перавалах і цяснінах ДРА, дапамагаў братняму народу будаваць і адстойваць лепшае жыццё.*

*Сёння яны — студэнты. Вясёлыя і маўклівыя, гарэзлівыя і часам сумныя. І хаця вакол іх свае, родныя, і не рвецца паветра больш кулямі, не трэба хаваць галаву ў плечы і прыціскацца да зямлі, бой для іх, напэўна, ніколі не скончыцца нават у мірным жыцці, заспакоенасць больш не кране іх душы. Таму цягне іх адзін да аднаго, яны сустракаюцца, гавораць, успамінаюць, думаюць, як будаваць жыццё далей. Афганістан ім ужо не забыць ніколі...*

*(Працяг на 2-й стар.).*

*абмяркоўваем праект Статута ВЛКСМ*

## Больш патрабавальнасці

ХАЧУ ВЫКАЗАЦЬ СВАЕ ПРАПАНОВЫ ПА ЗМЯНЕННЮ І ДАПАЎНЕННЮ ШЭРАГУ ПАЛАЖЭННЯЎ ПРАЕКТА СТАТУТА ВЛКСМ.

ДУМАЮ, ШТО НІ ДЛЯ КАГО НЕ САКРЭТ, ШТО ЗАЙМАЦЦА СЕННЯ ПАЎМЕРАМІ — ПУСТАЯ СПРАВА. У СУВЯЗІ З ГЭТЫМ ПРАПАНУЮ:

1. У п. 7 (§ 1): «Член ВЛКСМ, выбыўшы з арганізацыі без зняцця з камсамольскага ўліку, пасля заканчэння аднаго года можа быць зняты з уліку як фактычна страціўшы сувязь з ВЛКСМ...» замяніць словы «можа быць» на «павінен быць», а далей — па тэксту. Поўнасцю згодзен з думкай, што для палітычнай арганізацыі, якой з'яўляецца камсамол, ёсць нешта зневажальнае ў цяжкай працы па пошуку і зняццю з уліку «мёртвых душ». І хаця мой сакратарскі вопыт нёвялікі, але ўсю гэтую зневажальнасць адчуў у поўнай меры.

2. З п. 8 (§ 1): «Пытанне аб члене ВЛКСМ, не заплаціўшым членскія ўзносы без уважлівай прычыны на працягу трох месяцаў, належыць абмеркаванню ў пярвічнай камсамольскай арганізацыі»,— наогул зняць тэрмін, а тым больш «тры месяцы». Далей прапаную змяніць гэта палажэнне так: «падлягае абмеркаванню і прыцягненню да камсамольскай адказнасці».

3. Максімальны час на падачу апеляцыі і яе разгляд скараціць удвая. Згадзіцеся, што чатыры месяцы — вельмі вялікі тэрмін для «неакрэсленасці» маладога хлопца ці дзяўчыны. Думаю, што варта вызначыць месяц на апеляванне і месяц — на разгляд апеляцыі.

Упэўнены, што член ВЛКСМ абавязаны: «Беражліва адносіцца да прыроды». Прапаную дапоўніць гэтым палажэннем п. 2 (§ 1).

Прапаную ў п. 45 (§ 5) абавязкова дапоўніць: «Камітэты камсамола могуць ствараць часовыя камсамольскія арганізацыі... у спартыўных камандах». Сёння нярэдка яшчэ можна сутыкнуцца, прама скажам, з маладушшам, «неспартыўнасцю» шэрагу спартсменаў. А з другога боку — трэба ўзмацніць камсамольскі ўплыў у спорце як у «вялікім», так і ў «малым».

Своечасовым лічу наступнае статутнае патрабаванне (гл. п. 50 (І) (§ 5): «Пярвічная камсамольская арганізацыя... заслухоўвае справаздачы камсамольцаў аб выкананні статутных абавязкаў і грамадскіх даручэнняў». Лічу мэтазгодным, аднак, дадаць — «рэгулярна заслухоўвае і дае ацэнку яго дзейнасці».

І. ГАНЧАРОНАК,
сакратар камітэта камсамола
фізічнага факультэта.

# Філасофія і ЭВМ

карысны вопыт

**СЁННЯ, У ЧАС НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, ЭЛЕКТРОННА-ВЫЛІЧАЛЬНАЯ ТЭХНІКА ЎРЫВАЕЦЦА ВА ЎСЕ ГАЛІНЫ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ ГРАМАДСТВА. ВЫЗВАЛЯЮЧЫ АД МАЛАПРАДУКЦЫЙНАЙ, АДНАСТАЙНАЙ ПРАЦЫ, ЯНА АДКРЫВАЕ ПЕРАД ЧАЛАВЕЦТВАМ САПРАЎДЫ БЯЗМЕЖНУЮ ПРАСТОРУ ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ.**

ПРАЦЭС камп'ютэрызацыі не мог абысці бокам і сістэму вышэйшай адукацыі. Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна адным з першых пачаў укараненне ў вучэбны працэс прынцыпова новых форм навучання з дапамогай ЭВМ — аўтаматызаваных навучаючых сістэм (АНС). Прыкладзена шмат намаганняў па іх стварэнню і ўкараненню. І цяпер, калі падведзены першыя вынікі, трэба паклапаціцца, каб вопыт беларускіх выкладчыкаў не застаўся марным, каб быў шырока распаўсюджаны сярод ВНУ краіны.

Хацелася б выказацца па аднаму з пытанняў гэтага вопыту. Гутарка пойдзе пра стварэнне АНС па грамадскіх навуках. Партыя надае апошнім важнейшае значэнне, што было падкрэслена на XXVII з'ездзе КПСС, у Пастанове ЦК КПСС «Аб часопісе «Коммунист», на Усесаюзнай нарадзе загадчыкаў кафедраў грамадскіх навук.

Трэба сказаць, што ў выкладанні грамадскіх дысцыплін — асабліва моцная інерцыя традыцыйных метадаў навучання. І тым каштоўней факт, што сярод выкладчыкаў-грамадазнаўцаў БДУ знайшліся такія, якія ўзялі на сябе нялёгкую працу па стварэнню і ўкараненню цалкам новых прыёмаў і спосабаў вывучэння грамадскіх навук. Гэта, безумоўна, піянеры сваёй справы.

Падзялюся некаторымі ўражаннямі, думкамі пра вопыт стварэння кантрольна-навучальных праграм па курсах дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму. Гэтыя праграмы распрацаваны на філасофскіх кафедрах універсітэта дацэнтамі М. Я. Зайцавым, І. М. Марозавым, старшым выкладчыкам Ю. С. Шынкаром пры актыўным удзеле старшага інжынера кафедры электронна-матэматычных машын факультэта радыёфізікі і электронікі Л. В. Лазаравай.

Праграмы ўяўляюць своеасаблівы машынны калёквіум па дзвюх асноўных філасофскіх дысцыплінах. У аснову праграмы па дыялектычнаму матэрыялізму пакладзена філасофская праца У. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Паколькі вывучэнне гэтай працы падводзіць вынікі спасціжэння дыялектычнага матэрыялізму, то ў праграму ўключаны заданні па ўсіх раздзелах курса — усяго 50 пытанняў. Праграма па гістарычнаму матэрыялізму складаецца з 44 заданняў па ўсіх вывучаемых тэмах.

Паміж дзвюма праграмамі ёсць пэўныя адрозненні як па сістэме ацэнкі ведаў, так і па прынцыпу мадэліравання. У прыватнасці, па працы «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» праграма носіць дыялогавы характар і мяркуе свабоднае канструяванне адказаў і выбар гатовых адказаў. А па гістарычнаму матэрыялізму студэнтам прапануюцца толькі праграмныя заданні з выбарам адказаў, хаця цяпер вядзецца работа над тым, каб і гэта праграма выконвалася ў дыялогавым рэжыме. У цэлым маецца самы першы вопыт, які, зразумела, будзе ўдасканальвацца.

Але не гэта галоўнае. Галоўнае — гэта адносіны студэнтаў да заняткаў у класах АТНС-1, АТНС-2. Куды толькі знікаюць абыякавыя адносіны да філасофіі! Справай гонару становіцца выканаць праграму да канца і вызначыць узровень сваіх ведаў. Большасць студэнтаў добра разумее, што філасофскія веды выпрацоўваюць і выхоўваюць культуру мыслення. А да ЭВМ асабліва не прыдзярэшся, узровень гэтай культуры яна здольна высветліць аб'ектыўна.

Выкарыстанне АНС у працэсе выкладання філасофіі стымулюе цікавасць студэнтаў да прадмета. Адсюль недалёка да наступнага кроку — асэнсавання ягона значэння для будучага спецыяліста і грамадзяніна сваёй краіны.

Важнейшай функцыяй АНС застаецца, аднак, навучанне, кантроль ведаў. На сённяшні дзень мы павінны канстатаваць прыярытэт кантролю над навучаннем. Трэба меркаваць, што ў будучым гэтыя суадносіны зменяцца.

І яшчэ: ЭВМ забяспечвае індывідуальны падыход і зваротную сувязь пры авалоданні матэрыялам. А гэта значыць, што яна ў стане забяспечваць засваенне асноў марксісцка-ленінскай філасофіі практычна кожным студэнтам. І мы не перабольшваем. Фундаментальныя палажэнні марксізму-ленінізму адназначныя, могуць быць перакладзены на машынную мову.

Выкарыстанне ЭВМ у грамадазнаўстве робіць першыя крокі, таму важна падтрымаць гэты працэс. Справа тут як за прафесарска-выкладчыцкім саставам, так і за студэнтамі. Выкладчыку распрацоўка вучэбнай праграмы для АНС, акрамя ўсяго іншага, дазваляе больш дакладна вызначыць структуру, логіку выкладання і доказаў, тэрміналагічную строгасць кожнай тэмы і курса ў цэлым. Не абсалютызуючы ролю ЭВМ, адзначым, што машына ў стане пры адпаведнай праграме дапамагчы выпрацаваць і замацаваць у студэнтаў пярвічныя звычкі аперыравання асноўнымі паняццямі і законамі. У сілу гэтага традыцыйныя формы заняткаў — лекцыі і семінары — будуць пазбаўлены ад элементаў шкалярства і стануць сапраўднай лабараторыяй творчага прымянення ведаў у мэтах выхавання светапогляднай і метадалагічнай культуры маладых спецыялістаў.

Значэнне выкарыстання АНС у выкладанні грамадскіх навук цяжка пераацаніць. Па-першае, гэта вялікая эканомія часу і сіл у сувязі з рэзкім ростам эфектыўнасці і якасці навучання. Па-другое, гэта добрая магчымасць для творчай самаадукацыі і самакантролю. Па-трэцяе, гэта магчымасць выпрацаваць у студэнта лагічную стройнасць і моўную дакладнасць мыслення. Урэшце, гэта спосаб сістэматызацыі, праверкі і ўдакладнення ведаў, што асабліва важна ў перыяды сесій.

Ужо існуючыя праграмы-калёквіумы, калі іх выконваць у працэсе падрыхтоўкі да заліку ці экзамена, могуць забяспечыць значны рост якасці аб'ёму ведаў.

Мяркуецца, што да гэтага не трэба абыякава ставіцца. Насупраць, трэба ўкараняць і прапагандаваць. Я, напрыклад, па прыездзе ў свой інстытут абавязкова буду імкнуцца, каб рэалізаваць вопыт, назапашаны выкладчыкамі БДУ па выкарыстанню ЭВМ у выкладанні марксісцка-ленінскай філасофіі.

І. НАГДЗІМУНАЎ,
слухач інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ імя У. І. Леніна, старшы выкладчык кафедры філасофіі Пензенскага політэхнічнага інстытута, кандыдат філасофскіх навук.

23 лютага — Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту

# Надзейны шчыт Айчыны

**23 ЛЮТАГА САВЕЦКІ НАРОД УРАЧЫСТА АДЗНАЧАЕ ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ, СТВОРАНЫХ ВЯЛІКІМ ЛЕНІНЫМ. КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫЯЙ УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ СССР З ПЕРШЫХ ДЗЁН СВАЙГО ІСНАВАННЯ З ГОНАРАМ ВЫКОНВАЮЦЬ УСКЛАДЗЕНУЮ НА ІХ ГІСТАРЫЧНУЮ МІСІЮ НАДЗЕЙНАГА АБАРОНЦЫ ІНТАРЭСАЎ НАРОДА, ЯГО МІРНАЙ СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ АД ЗАМАХАЎ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНЫХ АГРЭСАРАЎ, З'ЯЎЛЯЮЦЦА АПОРАЙ УСЕАГУЛЬНАГА МІРУ.**

РАШАЦЬ задачы камуністычнага будаўніцтва нашай краіне прыходзіцца ва ўмовах абвостранай міжнароднай абстаноўкі. Мілітарысцкія колы ЗША і іх саюзнікі па агрэсіўных блоках выношваюць усё новыя планы супраць СССР і сацыялістычных краін. Савецкі народ, наша Камуністычная партыя, як адзначалася на студзеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС, упэўнены ў сваіх Узброеных Сілах. Яны робяць усё дзеля іх умацавання і маюць права разлічваць, што ніякія агрэсіўныя сілы не змогуць застаць нас знянацку.

Важную ролю ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны адыгрывае добра наладжаная сістэма ваенна-патрыятычнага выхавання савецкіх людзей, асабліва моладзі. Яна заклікана фарміраваць у маладога пакалення пачуццё воінскага абавязку, імкненне аддаць Радзіме ўсе сілы, а калі патрабуецца, і жыццё дзеля ажыццяўлення камуністычных ідэалаў.

Вось чаму палажэнні Праграмы КПСС, рашэнні XXVII з'езда КПСС з асаблівай сілай ставяць перад усімі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі задачу далейшага ўдасканалення ваенна-патрыятычнага выхавання. Адной з галоўных умоў дасягнення рэзультатыўнасці ваенна-патрыятычнага выхавання ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна з'яўляецца комплексны падыход да арганізацыі гераіка-патрыятычнай работы, забеспячэнне дзелавых кантактаў паміж арганізацыямі ВЛКСМ, ДТСААФ, таварыствам «Веды», ветэранамі вайны і працы, воінскімі падраздзяленнямі.

Ва універсітэце навучаюцца студэнты, якія прайшлі службу ў радах Савецкіх Узброеных Сіл, частка з іх дастойна выканала свой інтэрнацыянальны абавязак. Болей стала надавацца ўвагі прапагандзе рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый, распаўсюджванню сярод студэнцкай моладзі ваенных ведаў.

Разам з тым у арганізацыі патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі маецца яшчэ шмат нявырашаных праблем. Недастатковая ўвага надаецца развіццю ваенна-прыкладных відаў спорту. Ніяк не можа задаволіць нас становішча з масавасцю фізічнай культуры. Вельмі слабай з'яўляецца яе матэрыяльная база. Не ўсё робіцца дзеля таго, каб кожны малады чалавек да ўступлення ў рады Узброеных Сіл атрымаў у арганізацыях ДТСААФ, у спартыўных секцыях неабходныя яму тэхнічную спецыяльнасць і фізічную натрэніраванасць для воінскай службы.

Далёка не ўсе магчымасці выхавання і падрыхтоўкі маладых патрыётаў выкарыстоўваюцца ў арганізацыях ветэранаў вайны і працы. Каб дзейнасць атрымала належны размах і дзелавітасць, трэба партыйным арганізацыям карэнным чынам перабудаваць іх працу, умацаваць людзьмі, падрыхтаванымі тэарэтычна і прафесійна, якія ў поўнай меры адчуваюць патрабаванні часу, здольны працаваць з моладдзю творча.

На жаль, ёсць факты, калі асобныя ветэраны самаўхіляюцца ад гэтай важнай партыйнай і дзяржаўнай справы, рэдка выступаюць перад моладдзю, часам без агеньчыка. Сустрэчы ветэранаў са студэнтамі адбываюцца на асобных факультэтах ад свята да свята. Недастатковая ўвага надаецца правядзенню індывідуальнай работы. Слаба выкарыстоўваюцца ў правядзенні гераіка-патрыятычнага выхавання выступленні воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Не належным чынам для прыцягнення ў актыўную ваенна-патрыятычную работу выкарыстоўваюцца заахвочванні ветэранаў, тых, хто ініцыятыўна, не шкадуючы сіл і здароўя, удзельнічае у арганізацыі і правядзенні гераіка-патрыятычнай работы.

У нашай краіне складваецца новая маральная атмасфера, пераадольваюцца негатыўныя з'явы ў сацыяльным жыцці. Перад кожным працоўным калектывам стаяць сёння вялікія і адказныя задачы. Рашаць іх будуць таксама ветэраны вайны і працы. Сваёй прынцыповасцю, сумленнасцю яны, як заўсёды, будуць у першых радах тых, хто не на словах, а на справе выконвае свой грамадзянскі абавязак — мацуе эканамічную і абаронную магутнасць Савецкай Краіны.

Са святам вас, дарагія таварышы!

І. МАРЧАНКА,
старшыня савета ветэранаў вайны і працы універсітэта, дацэнт.

са святам!



(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

*Многа зараз гаворыцца, пішацца пра гэтую незвычайную катэгорыю незвычайных людзей. Аб іх абвостраным пачуцці справядлівасці, аб іх моцным жаданні не сядзець склаўшы рукі, не чакаць дырэктыў, а адразу ўключацца ў работу, аддаючы сваю энергію, веды, вопыт выхаванню падрастаючага пакалення, на барацьбу з недахопамі, з усім негатыўным у жыцці. З гэтай нагоды ў многіх ВНУ, пры многіх гаркомах, райкомах камсамола ствараюцца саветы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Ёсць такая секцыя і пры камітэце камсамола універсітэта. Гаворыць адзін з яе членаў, студэнт юрыдычнага факультэта Юрый Бацян:*

*— Часам нас папракаюць, што перш чым змагацца за справядлівасць, трэба паглядзець, маўляў, і вакол сябе: сярод былых інтэрнацыяналістаў ёсць і такія, якіх саміх трэба выхоўваць. Так, ёсць. Гэта тыя, каго нават служба ў абмежаваным кантынгенце не змагла перавыхаваць. Яны як прыйшлі на службу толькі спажыўцамі, так імі і вярнуліся. Але такіх адзінкі. Супрацьлегласць ім — сапраўдныя мужчыны, мужныя духам — Аляксандр Дзямяшкевіч, член парткома універсітэта, дэпутат гарсавета, і камандзір аператрада Сяргей Макаранка, і Эдуард Сапега, і Аляксандр Зелянкоў, і многія-многія іншыя...*

(Працяг на 4-й стар.).



*палявая пошта*

З дзяцінства запомнілася мне: у Дзень Перамогі, праведаўшы аднапалчан, якія засталіся ў жывых, дзед, пазвоньваючы медалямі, дастае з паліцы пласцінку, уключае старэнькі прайгравальнік — і цішыню ў доме парушае нягучны, хрыплаваты голас Марка Бернэса:

«...Пусть дождик льет,
окопы заливая,
На всей Земле сухого
места нет,
Когда приходит почта
полевая,
Солдат теплом далеким
обогрет...»

Нахіліўшы над сталом сівую галаву, дзед яшчэ і яшчэ раз ставіць старую пласцінку, употай ад дамашніх выцірае вочы. Аб чым думаў ён у тую мінуту, якія карціны ўжо даўняй вайны ўставалі ў яго перад вачыма?..

...Когда приходит почта
полевая,
Солдат теплом далеким
обогрет.

Наўрад ці здагадваўся я тады, што хутка мне давядзецца ў поўнай меры зразумець глыбокі сэнс гэтых няхітрых слоў.

# Пішыце, дзяўчаты, салдатам!..

ПАГРАНІЧНЫ нарад замёр у чаканні начальніка заставы. Звычайна маёр Кінчак аддаваў загад мінута ў мінуту ва ўказаны час, а зараз нешта не спяшаўся. Нарэшце дзверы канцылярыі адчыніліся — і афіцэр павольна наблізіўся да пагранічнага нарада.

Акінуўшы ўважліва строй пагранічнікаў, задаў традыцыйнае пытанне:

— Службу несці можаце?

— Так точна,— нейкім глухім, не ўласцівым гэтаму вясёламу хлопцу голасам адказаў старшы пагранатрада яфрэйтар Гуйва.

«Так, па ўсяму відаць, мае рацыю сяржант Кабзенка, нельга яго ў такім стане на службу адпраўляць»,— падумаў маёр. А ўголас цвёрда сказаў:

— Не, таварыш яфрэйтар. Не здолееце вы несці службу як належыць, трэба вам адпачыць, — па-бацькоўску ўважліва паглядзеў у вочы салдату і параіў: — Схадзіце ў звальненне, горад жа побач... Старшына! Выдаць Гуйве параднае абмундзіраванне!

Ён заўсёды быў немнагаслоўным, наш начальнік заставы.

Як я потым даведаўся, Сяргей Гуйва атрымаў пісьмо ад сваёй, цяпер ужо былой, нявесты з халоднымі і жорсткімі, як прысуд, словамі: «Даруй, выходжу замуж».

Па-рознаму ўспрымаюць салдаты такія весткі. Тут усё залежыць ад характару, умення трымаць сябе ў руках, стойка пераносіць павароты лёсу. Па вопыту ведаю: не кожнаму ўдаецца дастойна сустрэць сумную вестку. Бо настрой салдата знаходзіцца ў прамой залежнасці ад трываласці яго «тылу», усяго таго, што ён любіць, што зараз, калі ён служыць, далёка ад яго. Гэта тыя нябачныя ніці, што звязваюць салдата з усім, што дарагое яму і блізкае.

Тры дні хадзіў Сяргей сам не свой: быццам кантужаны невясёлай весткай. І ўсё гэта нягледзячы на нашы спробы развеяць яго цяжкія думкі.

Пазней усё, вядома, стала на свае месцы — спецыфіка пагранічнай службы такая, што проста не застаецца часу «ўпадаць у меланхолію». Але ўжо не змог стаць Гуйва тым вясёлым, спагадлівым, умелым і хуткім салдатам, якім памяталі мы яго да атрымання ім злашчаснага пісьма.

Сам я пісем такіх не атрымліваў. Дзяўчына, з якой я сябраваў да прызыву на службу, наогул перастала пісаць мне праз два месяцы, ніяк гэта не тлумачачы.

Доўга раскрываць душу не буду, скажу толькі, што за два гады службы: днём і ноччу, зімой і летам я ўвесь час знаходзіўся пад уражаннем гэтага маўчання, ламаў галаву, што ж здарылася? Бо колькі ж гаварылі раней душэўных, цёплых слоў адзін аднаму, кляліся ў вернасці да магілы. І раптам такое...

Таварышы заўважылі, што ў мяне прапалі настрой, усмешка, аптымізм. Праўда, служыў я па-ранейшаму старанна. Бо прысягу не дзяўчыне даваў — Радзіме.

Цяпер я часта ўспамінаю, як ужо на другім годзе службы, будучы старшым пагранатрада, я па-добраму зайздросціў і радаваўся за маладога салдата, майго таварыша па службе, які прыбыў на заставу з вучэбнага падраздзялення. Пісьмы ад каханай Юра Піюрэнка атрымліваў кожны (!) дзень. І гледзячы, як святлее твар маладога салдата (а ім асабліва цяжка напачатку), станавілася зразумелым, чаму і служба, і палітвучоба, і работа па гаспадарцы — усё яму ўдавалася дакладна і спора, а галоўнае — яго ніколі не пакідаў добры настрой.

Ужо праз паўгода свайго звальнення ў запас я пабываў на роднай заставе яшчэ раз, пагаварыў з хлопцамі. Даведаўся, што паток пісьмаў, цяпер ужо сяржанту Піюрэнку, не аслабеў з цягам часу, як гэта часта бывае. Ад усёй душы мы радаваліся за нашага таварыша.

Зараз старшы сяржант Піюрэнка, выдатна адслужыўшы на граніцы, вучыцца ў інстытуце, хутка ў яго вяселле. Можна было б прывесці яшчэ нямала прыкладаў таго, якое значэнне для салдата маюць весткі з дому, але яны самі ні аб чым не скажуць, калі не зразумець галоўнае: трапіўшы ў армію, хлопцы ўсё ўспрымаюць намнога вастрэй, чым успрымалі дома.

Добрае пісьмо — гэта сапраўдная радасць, а дрэннае... Умовы ж службы нярэдка бываюць экстрэмальнымі, якія патрабуюць вялікіх фізічных і, перш-наперш, маральных сіл. Хлопцы абараняюць Радзіму, і дрэнна, калі гэта разумеюць адны яны.

Пасля арміі не позна пачаць дружбу з «чыстага ліста», так звычайна і бывае з адслужыўшымі, не варта ніколі страчваць надзею. Але ўсё ж словы песні: «Если к другому уходит невеста, то неизвестно, кому повезло» — слабая ўцеха для салдата. Яму хочацца верыць у іншыя словы: «Вы служите, мы вас подождем».

Пішыце, дзяўчаты, салдатам!

Г. КАЖАМЯКІН,
яфрэйтар запасу,
студэнт.

*са святам!*



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

*Ларыса Зюзіна вучыцца на ПА ў адной групе з Сяргеем Макаранкам, Аляксандрам Зелянковым, Іванам Навумчыкам, іншымі воінамі-інтэрнацыяналістамі. Яна — партгрупорг, намеснік сакратара камітэта камсамола падрыхтоўчага аддзялення.*

*Ад імя Ларысы віншуем усіх яе аднакурснікаў, ад імя жанчын універсітэта віншуем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, усіх мужчын універсітэта з надыходзячым святам — Днём Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту!*

*С. ПЛЫТКЕВІЧ.*
*Фота аўтара.*

*мы — людзі савецкія*

# На сваіх крылах

**Нядаўна прачытаў у газеце «Правда» артыкул пра гісторыю самалёта «Бостон», які быў падараваны савецкім лётчыкам амерыканскім акцёрам Рэдам Скелтанам, і мне захацелася падзяліцца з чытачамі сваімі ўспамінамі.**

ВЕРАЛОМНАЕ нападзенне фашысцкай Германіі на нашу Айчыну выклікала нябачаны гераізм савецкага народа як на фронце, так і ў тыле. У краіне разліўся паўнаводнай ракой народны рух за збор сродкаў на ўзбраенне Чырвонай Арміі. Рабочыя, калгаснікі, служачыя будавалі на свае сродкі артылерыйскія батарэі, танкавыя калоны, браняпаязды. Толькі са снежня 1942 года па красавік 1943-га для ўзбраення Чырвонай Аміі ад працоўных паступіла звыш 7 мільярдаў рублёў, а за чатыры гады добраахвотныя ўзносы ад насельніцтва на патрэбы арміі склалі каля 95 мільярдаў рублёў. Звыш 2 мільярдаў 350 мільёнаў рублёў перадалі савецкія людзі на будаўніцтва баявых самалётаў. На гэтыя сродкі было пабудавана звыш 2,5 тысячы машын. Працоўныя накіроўвалі на фронт тысячы эшалонаў з падарункамі для абаронцаў Радзімы. Усё гэта — сведчанне жыватворнага савецкага патрыятызму, непарушнай еднасці саюза рабочага класа і сялянства, адзінства савецкага народа.

Калі фашысты рваліся да Волгі, патрыёт нашай Радзімы Ферапонт Пятровіч Галаваты, калгаснік калгаса «Стаханавец» Саратаўскай вобласці ўнёс усе свае асабістыя зберажэнні на пабудову самалёта. Знішчальнік быў дастаўлены на фронт, на ім сваяк Ферапонта Галаватага маёр Яромін граміў фашысцкіх вырадкаў.

Пачын Ферапонта Галаватага знайшоў шырокі водгук не толькі сярод калгаснікаў, але і сярод лётчыкаў, штурманаў, тэхнікаў. Прачытаўшы паведамленне ў «Правде» пра патрыятычны ўчынак Ферапонта Галаватага, наш экіпаж у саставе Васіля Лявонцьевіча Ульянава, Аляксея Мікалаевіча Пятрова і мяне, штурмана, вырашыў набыць на свае ўласныя зберажэнні самалёт, на якім змагацца з фашысцкай поганню.

У той час мы служылі на Далёкім Усходзе. Ішлі жорсткія баі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Неспакойна было і на ўсходніх рубяжах нашай Радзімы. Некалькі разоў падавалі рапарт аб адпраўцы нас на фронт, але камандаванне не давала дазволу. Тады мы, камсамольцы, звярнуліся з лістом да Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, у якім пісалі, што за свае ўласныя зберажэнні купляем самалёт і просім дазволу накіраваць нас на фронт.

З нецярплівасцю чакалі адказу. Выразна прыпамінаю той дзень, калі нас выклікалі ў штаб, як нам думалася, для чарговага задання. Але што гэта? Камандзір дывізіі палкоўнік Абраменка паказвае тэлеграму і тут жа зачытвае: «Лейтэнанту Ульянаву, малодшаму лейтэнанту Булацкаму і старшаму тэхніку-лейтэнанту Пятрову. Дзякую за працу ў Ваенна-Паветраных Сілах Чырвонай Арміі. Ваша жаданне будзе выканана. Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Савецкага Саюза І. Сталін».

Прыблізна праз тыдзень былі арганізаваны провады. Да самых дробязей памятаю іх. З цёплай прамовай выступіў камандзір эскадрыллі капітан Клімаў. Яго прамова была пра галоўнае: біць бязлітасна фашысцкага звера. Потым выступілі нашы таварышы, сябры, стралок-радыст Андрэй Якаўлевіч Басаргін, інжынер эскадрыллі капітан Анатоль Васільевіч Межанцаў і іншыя. Усе яны жадалі нам поспехаў у барацьбе з фашысцкімі вандаламі. І мы заверылі, што будзем ваяваць, не шкадуючы свайго жыцця.

Наш прыклад перанялі многія лётчыкі-далёкаўсходнікі. Праз многа гадоў, ужо пасля вайны, я прачытаў у «Курортной газете», органе Крымскага абкома КП Украіны, абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 26 кастрычніка 1973 года ўспаміны Якава Міхайлавіча Яблонскага, якога таксама вайна застала на Далёкім Усходзе. Ён расказваў, як прачытаў у адным з нумароў «Правды» за 1943 год пра пачын Ферапонта Галаватага, а потым — не менш хвалюючую вестку: «Летчык В. Ульянаў, штурман малодшы лейтэнант Р. Булацкі і авіятэхнік А. Пятроў на свае грошы набылі бамбардзіроўшчык і на ім паляцелі граміць ворага». «Вось выйсце!» вырашыў пра сябе Яблонскі і падзяліўся сваёй думкай з членамі экіпажа. І яны вырашылі пераняць наш прыклад. Услед за намі многія экіпажы пачалі ўносіць грошы на самалёты. Чамаданамі прыносілі лётчыкі грошы ў банкі. Такім быў патрыятычны парыў паветраных байцоў.

Набывалі на свае ўласныя зберажэнні і танкі. Для нашага экіпажа прыкладам быў не толькі патрыятычны ўчынак Ферапонта Галаватага, але і сям'і Байко. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Аляксандра Лявонцьеўна Байко працавала кантралёрам на «Калымснабе», а яе муж Іван Фёдаравіч шафёрам. 23 чэрвеня 1941 года яны прыйшлі ў ваенкамат з просьбай накіраваць іх на фронт, але атрымалі адмову. Наступныя спробы таксама былі беспаспяховымі.

Тады Іван Фёдаравіч прапанаваў жонцы напісаць пісьмо Галоўнакамандуючаму. «На сабраныя 50 тысяч рублёў жадаем набыць танк, — пісалі Байко,— і на гэтай машыне ўласнымі рукамі знішчаць фашысцкіх акупантаў». Просьба была задаволена. Яны былі накіраваны ў Чэлябінскае танкавае вучылішча. Закончылі яго экстэрнам за чатыры месяцы малодшымі тэхнікамі-лейтэнантамі. Пад Тулай ім даверылі навейшую па таму часу машыну — танк «ІС», на якім быў надпіс «Патрыёты Байко». Патрыёты Байко мужна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Былі паранены. Знаходзіліся на лячэнні ў шпіталях, потым зноў фронт.

Вайну гвардыі старшыя лейтэнанты А. Л. Байко і яе муж І. Ф. Байко скончылі ў Празе. На баявым рахунку сямейнага гвардзейскага экіпажа — чатыры танкі фашыстаў, шмат іншай тэхнікі і зброі, а таксама сотні гітлераўцаў.

Вялікая колькасць патрыётаў, якія па ўзросту не маглі трапіць на фронт, набывалі на свае ўласныя грошы танкі і самалёты і перадавалі іх камандаванню. Так, танк пад назвай «Маці-Радзіма» быў падораны фронту ад сям'і Арловых, пяць прадстаўнікоў якой змагаліся з ворагам. Галава сям'і Фёдар Міхайлавіч Арлоў быў камандзірам дывізіі народнага апалчэння, паў смерцю мужных у баі. Аддалі за Радзіму самае дарагое — жыццё — і яго два сыны: Уладзімір — апалчэнец і Васіль — гвардыі палкоўнік, камандзір корпуса, Герой Савецкага Саюза. У 1944 годзе Марыя Іосіфаўна Арлова перадала ў Фонд абароны ўсе ўласныя зберажэнні сям'і, сярод якіх быў залаты партсігар, якім Рэўваенсавет рэспублікі ўзнагародзіў яе мужа за заслугі ў разгроме Врангеля. Танк сям'і Арловых «Маці-Радзіма» прайшоў вялікі шлях, на ім героі-танкісты ўдзельнічалі ў многіх баях. Экіпаж танка штурмаваў Берлін. Цяпер ён знаходзіцца на п'едэстале ў ваенным гарадку аднаго з танкавых палкоў.

Не толькі дарослыя прымалі ўдзел у патрыятычным руху. Не адставалі і піянеры, і дзеці дашкольнага ўзросту. У танкавым Фастаўскім палку змагаўся танк Т-60, на брані якога быў надпіс «Малютка». Гісторыя стварэння яго такая. 6-гадовая дзяўчынка Ада Занечына напісала ліст у «Омскую правду». Вось вытрымка з гэтага ліста: «Я — Ада Занечына. Мне 6 гадоў... Гітлер выгнаў мяне з горада Сычаўка Смаленскай вобласці. Я хачу дадому. Мама аддала грошы на танкі. Я сабрала на куклу 122 рублі 25 капеек. А цяпер аддаю іх на танк.

Дарагі дзядзька рэдактар! Напішыце ў сваёй газеце ўсім маленькім дзецям, каб яны таксама свае грошы аддалі на танк і назвалі яго «Малютка». Калі наш танк разаб'е Гітлера, мы паедзем дадому».

Гэты заклік шасцігадовай дзяўчынкі, дачкі танкіста-франтавіка, які загінуў у баях на Курскай дузе, быў пачуты ўсімі. Быў адкрыты спецыяльны рахунак у Дзяржбанку за № 350035. Дашкольнікі Омска ўнеслі на гэты рахунак 179 тысяч рублёў. І танк «Малютка» змагаўся з гітлераўцамі, ім кіравала Кацярына Пятлюк. Шасцігадовая Ада атрымала ад яе пісьмо з фронта, а мастакі Кручкоў і Паленаў даслалі партрэт Кацярыны Пятлюк з надпісам: «Дарагой Адачцы, ініцыятару будаўніцтва танка «Малютка».

Такім быў масавы гераізм, праяўлены савецкім народам у час Вялікай Айчыннай вайны як на фронце, так і ў тыле.

Р. БУЛАЦКІ,
доктар гістарычных навук,
прафесар, загадчык кафедры
гісторыі журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МБПА імя Я. Коласа.

19 лютага 1987 года.

АТ 00226. Зак. 251.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ.